Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

[4] Служэбнік. М., 1602. Прэзідэнцкая бібліятэка Беларусі. Шыфр: 25502. Арк. 1–7 2-га сшытка, 7–8 19-га сшытка–1 21-га сшытка.

[5] Трыёдзь кветная. М., 1621. Цэнтральная навуковая бібліятэка НАН Беларусі. Шыфр: К16–18 / Ср160. Арк. 1-39.

[6] *Лебедь М.А.* Деятельность Московского печатного двора как фактор укрепления российской государственности : (на примере минейного комплекса первой трети XVII в.) : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук : 07.00.02. Москва, 2011. С. 26.

[7] *Дадыкин А.В.* Источники по истории издания и распространения первых Московских Прологов 1641 и 1642/43 гг. : Автореф. дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук : 07.00.00; 07.00.09. Москва, 2001. С. 14.

[8] *Поздеева И.В.* Ранние кириллические издания и книжная культура русского старообрядчества // Человек. Книга. История : московская печать XVII века. Москва, 2016. С. 536.

[9] Евангелле. М., [1617]. Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі. Шыфр: К16-18/Ср159. Арк. 14–46 (I).

[10] *Белянкин Ю.С.* Церковь и государство в полемике со старообрядцами во второй половине XVII в. : (на примере деятельности Московского Печатного двора) : автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук : специальность 07.00.02. Москва, 2012. С. 6, 8, 26–27.

[11] Акты исторические, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. 3. Санкт-Петербург, 1841. С. 154.

[12] Дополнения к Актам историческим, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. 8. Санкт-Петербург, 1862. С. 219–222.

[13] *Бубнов Н.Ю.* Старообрядческая книга третьей четверти XVII в. как историко-культурный феномен // Книжная культура старообрядцев : статьи разных лет. Санкт-Петербург, 2007. С. 12, 22–23.

УДК 098(476)

*Н.М. Слука*

# Віленскія царкоўна-грамадскія часопісы на беларускай мове 1920–1930-х гг. (па фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі)

У артыкуле разглядаецца беларуская царкоўна-грамадская перыёдыка, выдадзеная у Вільні ў міжваенны перыяд. Аналізуецца гісторыя выхаду беларускіх царкоўных часопісаў як складовай часткі беларускага праваслаўнага руху ў Польшчы. Падаецца



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by
агляд праваслаўнай перыёдыкі, якая зберагаецца ў фондах аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі.
*Ключавыя словы*: Заходняя Беларусь, праваслаўная царква, перыёдыка, міжваенны перыяд.

*Н.М. Слука*

## Виленские церковно-общественные журналы на белорусском языке 1920–1930-х гг. (по фондам отдела редких книг и рукописей Центральной научной библиотеки НАН Беларуси)

В статье рассматривается белорусская церковно-общественная периодика, изданная в Вильно в межвоенный период. Анализируется история выхода белорусских церковных журналов как составной части белорусского православного движения в Польше. Представлен обзор православной периодики, которая хранится в фондах отдела редких книг и рукописей ЦНБ НАН Беларуси.
*Ключевые слова*: Западная Белоруссия, православная церковь, периодика, межвоенный период.

*N.M. Sluka*

## Belarusian Orthodox periodicals printed in Vilnius in the 1920s and 1930s (based on the funds of the rare books and manuscripts department of the Central Science Library of NAS of Belarus)

The article deals with the Belarusian church periodicals that were published in Vilnius during the interwar period. The history of publishing of periodicals is analyzed as a part of the Belarusian Orthodox movement in Poland. The review of the Belarusian church periodicals housed in the Central Science Library of NAS of Belarus is also given.
*Keywords*: Western Belarus, Orthodox Church, periodicals, interwar period.

Вільня і Віленскі край з'яўляліся цэнтрам беларускага руху ў міжваеннай Польшчы. У Вільні размяшчаліся разнастайныя бе-


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

ларускія грамадска-культурныя арганізацыі і палітычныя партыі, а таксама беларускія друкарні, кнігарні, студэнцкія аб'яднанні, знакаміты Беларускі музей імя І. Луцкевіча. Абсалютная большасць беларускіх кніг і перыёдыкі ў Польшчы была надрукавана менавіта ў Вільні. Вільня таксама з'яўлалася цэнтрам Віленскай епархіі, якая ахполівала ўсё Віленскае ваяводства і некалькі паветаў Навагрудскага ваяводства[1]. Хоць праваслаўнае насельніцтва Віленскага краю саступала па колькасці іншым ваяводствам з пераважна беларускім насельніцтвам (найбольшая колькасць праваслаўных пражывала ў Палескім ваяводстве), беларускі праваслаўны рух быў засяроджаны ў Вільні[2]. На працягу міжваеннага перыяду там дзейнічалі некалькі грамадска-палітычных праваслаўных арганізацый, ствараліся праваслаўныя суполкі сярод беларусаў-навучэнцаў Універсітэта Стэфана Баторыя і Віленскай праваслаўнай семінарыі, адбывалася супрацоўніцтва з украінскімі і рускімі праваслаўнымі аб'яднаннямі; там жа друкаваліся царкоўныя часопісы на беларускай мове.

Першым перыядычным выданнем праваслаўных беларусаў, якое выйшла у Вільні, стаў часопіс «Праваслаўная Беларусь». Часопіс выдаваўся Праваслаўным беларускім дэмакратычным аб'яднаннем (ПБДА) у 1927–1928 гг.; рэдактарам з'яўляўся актыўны дзеяч беларускага нацыяльнага руху протаіерэй Л. Голад. ПБДА стала першай афіцыйнай арганізацыяй праваслаўных беларусаў у Польшчы, адной з галоўных мэт арганізацыі была беларусізацыя царквы: увядзенне выкарыстання беларускай мовы ў школьным рэлігійным навучанні, пропаведзях, семінарыях, пераклад свяшчэнных тэкстаў на беларускую мову. Адначасова ПБДА імкнулася да захавання праваслаўнай культуры і абароны праваслаўнай царквы ва ўмовах ўціску з боку дзяржаўных улад.

У часопісе «Праваслаўная Беларусь» найбольшая ўвага надавалася становішчу праваслаўнай царквы ў Польшчы, бягучым грамадска-палітычным падзеям, якія мелі ўплыў на царкоўнае жыццё. Паколькі ПБДА ўваходзіла ў Беларускі цэнтральны аб'яднаны выбарчы камітэт, які праводзіў у канцы 1927 г. – пачатку 1928 г. падрыхтоўку да выбараў у сойм і сенат, у часопісе ў дадзены перыяд друкавалася вялікая колькасць матэрыялаў, прысвечаных выбарам: палітычная платфорама камітэта і весткі аб яго дзейнасці, паведамленні аб палітычнай сітуацыі ў Заходняй Беларусі. У «Праваслаўнай Беларусі» рэгулярна публікаваліся лісты з розных вёсак і мястэчак са скаргамі на вынікі рэвіндыкацыі – дзяржаўнай кампаніі па прымусовай перадачы праваслаўных цэркваў


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

(пераважна былых уніяцкіх) у маёмасць каталіцкага касцёла. Таксама ў выданні падаваліся весткі аб стане праваслаўя ў СССР. У кожным нумары прысутнічалі раздзелы «Царкоўная хроніка», «Палітычная хроніка» і «З беларускага жыцьця». У фондзе аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі захоўваюцца наступныя нумары часопіса «Праваслаўная Беларусь»: № 5 за 1927 г., № 1, 2 і 5 за 1928 г.

У 1928 г. у Вільні пачаў выходзіць наступны царкоўны часопіс – «Народная Ніва», які выдаваўся адначасова на трох мовах: беларускай, украінскай і рускай[3]. Рэдактарам стаў адзін з найболей актыўных дзеячаў беларускага праваслаўнага руху протаіерэй А. Коўш. Пазней ў 1928 г. пачаў выходзіць часопіс «Беларуская Зарніца», які рэдагаваў таксама А. Коўш. Часопіс павінен быў выходзіць два разы на месяц, але ў яго выпуску здараліся перапынкі. У «Беларускай Зарніцы» друкаваліся артыкулы па гісторыі праваслаўнай і уніяцкай цэркваў на Беларусі, пераклады рэлігійных тэкстаў на беларускую мову, падаваліся агляды становішча праваслаўнай царквы ў Польшчы. Шмат увагі надавалася ўціску праваслаўных свяшчэннікаў і вернікаў, канфіскацыі царкоўнай маёмасці і будынкаў[4]. Выхад часопіс спыніўся ў 1929 г. У фондзе аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў захоўваюцца № 5 і 7–8 за 1928 г. і № 4 за 1929 г. «Беларускай Зарніцы».

Значным крокам у развіцці беларускага праваслаўнага руху стала стварэнне ў 1930 г. Цэнтральнага беларускага праваслаўнага камітэта па беларусізацыі царквы (ЦБПК). Камітэт быў арганізаваны падчас з'езда праваслаўных беларусаў у Вільне; яго ўзначалілі Т. Вернікоўскі, У. Більдзюкевіч, А. Коўш. ЦБПК планаваў адкрыццё бібліятэк і кнігарняў, а такскама правядзенне разнастайных курсаў дзеля пашырэння асветы сярод праваслаўных беларусаў. Акрамя гэтага ЦБПК ставіў на мэту абарону эканамічнага становішча царквы і святароў, барацьбу за справядлівае падаткаабкладанне праваслаўнага духавенства. Нягледзячы на адркыццё філіялаў ЦБПК у Віленскай, Гродзенскай і Палескай епархіях дзейнасць камітэта мела даволі абмежаваны характар. Адным з найбольш паслядоўных відаў дзейнасці ЦБПК было выданне друкаванага органа «Сьветач Беларусі». Часопіс выходзіў у 1930–1933 гг., кароткатэрміновая спроба аднавіць яго выхад была зроблена таксама ў 1936 г. Рэдактарамі часопіса былі З. Зімавец, Я. Бурак, У. Більдзюкевіч.

У часопісе друкаваліся адозвы, маніфесты і праграмныя палажэнні ЦБПК, справаздачы аб яго дзейнасці. Падаваліся хронікі


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

падзей з праваслаўнага жыцця ў Польшчы. Таксама ў часопісе вялікая ўвага надавалася аглядам артыкулаў, прысвечаных розным аспектам праваслаўнага руху, з беларускамоўнай, польскамоўнай і рускамоўнай прэсы; на старонках «Сьветача Беларусі» вялася актыўная палеміка з беларускімі каталіцкімі і польскімі праваслаўнымі выданнямі, з часопісамі рускай эміграцыі. У часопісе рэгулярна публікавалася чытацкая карэспандэнцыя.

У фодзе аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі захоўваюцца наступныя нумары часопіса: № 2-3 за 1930 г., № 1 (4), 2 (5), 3 (6) за 1931 г., № 1 за 1932 г., № 1 (8) за 1933 г. і № 1 (9) і 2 (10) за 1936 г. Адметнай рысай у афармленні часопіса (нумароў за 1932 і 1933 гг.) з'яўляецца надрукаваная непасрэдна на вокладцы форма для адраса атрымальніка. У № 1 (8) за 1933 г. форма запоўнена алоўкам наступным чынам: «Komu – Redakcja Gazety «Przegld Wilenski», poczta – Wilno. Uniwersit». У левым верхнім вуглу таксама алоўкам пазначана "Dublet". Іншая прыкмета бытавання знаходзіцца ў № 2 (10) за 1936 г. – на апошняй старонцы ў ніжнім правым вуглу чарніламі і напісана N. inw. 1737, а ў верхнім правым вуглу такімі самымі чарніламі – 0548.

Адным з выданняў, з якім вёў палеміку «Сьветач Беларусі» быў часопіс «Голас Праваслаўнага Беларуса», які выходзіў у 1931–1932 гг. пад рэдакцыяй М. Маркевіча. За выключэннем хронік з праваслаўнага жыцця Польшчы і чытацкай карэспандэнцыі матэрыялы часопіса былі пераважна прысвечаныя крытыцы дзейнасці ЦБПК і ў асаблівасці А. Каўша. Вялікая ўвага надавалася таксама праблеме аднаўлення ўніяцкай царквы на Беларусі.

У фондзе аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў захоўваюцца № 1 і 2 за 1931 г. і № 3 за 1932 г., якія паступілі ў бібліятэку ў 1991 г. На двух нумарах прысутнічаюць прыкметы бытавання. На апошняй старонцы № 2 за 1931 г. стаіць сіняя авальная пячатка з надпісам «Książnica t-wa pryzjacioł nauk w Wilnie» («Бібліятэка таварыства прыяцеляў навук у Вільні»). На вокладцы № 1 за 1931 г. прастаўлена круглая фіялетавая пячатка, большая частка якой сцерлася ці выцвіла. Аднак па захаваўшыся словах «Korporacja Sco…» і па сімвалу Францыска Скарыны «Сонца маладзіковае», які размешчаны ў цэнтры пячаткі, можна зрабіць выснову, што дадзены асобнік належаў студэнцкаму аб'яднанню «Скарынія», якое дзейнічала пры Універсітэце Стэфана Баторыя ў 1931–1934 гг.

Апошнім праваслаўным выданнем ў міжваеннай Вільне стаў часопіс «Царква і Народ», які выходзіў у 1932–1933 гг. пад рэдакцыяй Я. Балтручака. Часопіс друкаваўся праваслаўнай групоўкай у

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by
складзе палітычнай партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя». Асноўная частка матэрыялаў у часопісе тычылася праблем беларусізацыі царквы: абмяркоўваліся магчымыя захады па яе ажыцяўленню, крытыкавалася дзейнасць кіраўнікоў Віленскай епархіі, якія перашкаджалі выкарыстанню беларускай мовы ў царкоўных казаннях, рэлігійным навучанні і ў зносінах святароў з прыхаджанамі. Таксама друкаваліся хронікі падзей беларускага праваслаўнага руху, мастацкія творы рэлігійнай тэматыкі, гістарычныя нарысы. Выхад часопіса спыніўся пасля другога нумара. У фондзе аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў захоўваюцца № 1 за 1932 г. і № 1 (2) за 1933 г.

Такім чынам, у фондзе аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі даволі шырока прадстаўлены віленскія праваслаўныя часопісы на беларускай мове. Дадзены комплекс царкоўнай перыёдыкі з'яўляецца каштоўнай крыніцай па гісторыі Заходняй Беларусі, паколькі дазваляе прасачыць гісторыю беларускага праваслаўнага руху ў міжваеннай Польшчы. Прыкметы бытавання, якія прысутнічаюць на асобных выданнях, надаюць яму характар культурна-гістарычнага помніка.

[1] *Mironowicz A.* Kościół prawosławny na ziemiach polskich w XIX i XX wieku. Białystok : Wydawnictwo Uniwersytetu w Białymstoku, 2005. S. 100.

[2] *Вабішчэвіч А.М.* Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.). Брэст : БрДу імя А.С. Пушкіна, 2008. С. 88.

[3] *Traczuk J.* Czasopiśmiennictwo białoruskie w II Rzeczypospolitej (1918–1939). Siedlce : Wydawnictwo Uniwersytetu Przyrodniczo-Humanistycznego w Siedlcach, 2013. S. 159.

[4] Там жа. С. 124 ; *Горны А.С.* Беларускія праваслаўныя часопісы ў міжваеннай Польшчы: роспіс зместу // ΧΡΟΝΟΣ. Церковно-исторический альманах. 2015. № 2. С. 44–49.

УДК 655: 94(438)

*В.Ю. Соколов*

## Издания естественнонаучной тематики типографии Львовского коллегиума иезуитов в XVIII в.

В статье проанализированы особенности развития книгопечатания по естественным наукам и технике типографии Львовского коллегиума иезуитов в XVIII в. Изучены жанрово-типологический и тематический состав естественнонаучных изданий. Иссле-


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by